***І. М. Цэван,***
*аспірант*

# АБ НАВУКОВЫМ АСЭНСАВАННІ ФЕНОМЕНА *ЭТНАКУЛЬТУРНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Інтарэс да каштоўнасцей асобы заканамерна ўзрастае ў крызісныя, пераломныя этапы развіцця грамадства, у сувязі з гэтым павышаецца патрэбнасць у іх усебаковым асэнсаванні. На сучасным этапе адраджэння беларускай культуры, пошукаў сваіх каранёў асаблівай увагі патрабуюць праблемы вывучэння этнакультурных каштоўнасцей.

Пачынаючы з другой паловы ХХ ст. у савецкай і постсавецкай навуцы назапашаны пэўны вопыт асэнсавання каштоўнаснай праблематыкі. Найбольш шырока ён прадстаўлены ў работах па філасофіі, псіхалогіі, сацыялогіі; быў створаны пэўны метадалагічны апарат, з'явіліся работы, прысвечаныя пытанням тыпалогіі і іерархіі каштоўнасцей.

Працэс фарміравання каштоўнасцей асобы ў работах спецыялістаў педагогікі сацыяльна-культурнай дзейнасці асветлены вельмі сціпла, педагагічная аксіялогія арганізаванага вольнага часу знаходзіцца на шляху свайго станаўлення і развіцця. Найбольш шырока педагагічныя аспекты фарміравання каштоўнасцей прадстаўлены ў работах па праблемах арганізацыі адукацыйнага працэсу М. В. Багуслаўскага, А. М. Булыніна, Б. С. Гершунскага, Б. З. Вульфава, В. І. Гінецыянскага, Б. І. Дадонава, У. А. Каракоўскага, Р. Б. Карнетава, Б. Р. Кузняцова, В. Б. Міронава, М. Дз. Нікандрава, В. Г. Пранікавай, З. І. Раўкіна, В. М. Розіна, В. А. Сласцёніна, У. С. Собкіна, Ю. Б. Тупалава, М. І. Фішара, Г. І. Чыжаковай, Я. М. Шыянава, П. Г. Шчадравіцкага, Н. К. Шчэпкінай і інш.

Аналіз навуковых работ па праблеме фарміравання каштоўнасцей асобы дазваляе адзначыць некаторыя тэндэнцыі развіцця педагагічнай думкі ў гэтай вобласці: даследчыкі абапіраюцца на розныя навуковыя кірункі, методыкі, метадалогіі; адсутнічае адзінства ў вызначэнні сутнасці, структуры і спецыфікі асноўных паняццяў (*каштоўнасці, каштоўнасная свядомасць, каштоўнасныя адносіны, каштоўнасныя ўстаноўкі, каштоўнасныя арыентацыі, каштоўнасныя паводзіны*); недастаткова распрацаваны фарміруючыя и дыягнастычныя методыкі.

Паняцце *каштоўнасці* ахоплівае шэраг матэрыяльных і духоўных з'яў, якія служаць умовамі існавання чалавечага грамадства. Некаторым вучоным уласціва разуменне каштоўнасці як характэрнай менавіта для чалавека, групы, грамадства. В. А. Сласцёнін і Г. І. Чыжакова, напрыклад, вызначаюць каштоўнасці як «спецыфічныя ўтварэнні ў структуры індывідуальнай свядомасці, якія з'яўляюцца ідэальнымі ўзорамі і арыенцірамі дзейнасці асобы і грамадства»[1]. Адсюль асоба або грамадства ў цэлым разглядаюцца як носьбіты каштоўнасцей, а апошнія матывуюць дзеянні і ўчынкі чалавека.

Каштоўнасці з'яўляюцца найважнейшымі функцыянальнымі якасцямі ў структуры асобы і ўключаюць такія кампаненты, як *каштоўнасная свядомасць, каштоўнасныя адносіны, устаноўкі, арыентацыі, а таксама каштоўнасныя паводзіны* чалавека. Гэтыя кампаненты адначасова з'яўляюцца асноўнымі катэгорыямі педагагічнай аксіялогіі.

Каштоўнасная свядомасць разумеецца ў педагагічнай навуцы як форма адлюстравання і праектавання рэальнага жыцця людзей, іх памкнення ў будучыню з улікам вопыту і пражытага ўласнага лёсу. Такім чынам, працэс развіцця каштоўнаснай свядомасці разглядаецца ў цеснай узаемасувязі з асобасным развіццём чалавека. Каштоўнасная свядомасць можа вызначацца і як форма адлюстравання аб'ектыўнай рэчаіснасці, і як адзінства псіхічных працэсаў, якія актыўна ўдзельнічаюць у асэнсаванні чалавекам аб'ектыўнага свету і свайго ўласнага быцця. Вывучэннем праблем фарміравання каштоўнаснай свядомасці займаліся Я. Я. Валчкоў, Л. В. Вяршыніна, Т. А. Гяло і інш.

Каштоўнасныя адносіны, устаноўкі і арыентацыі адлюстроўваюць важныя ўнутраныя сувязі асобы з навакольнай рэчаіснасцю. Каштоўнасныя адносіны – гэта ўнутраная пазіцыя асобы, якая адлюстроўвае ўзаемасувязь асобасных і грамадскіх значэнняў. Каштоўнасныя адносіны вывучалі В. М. Акіньшына, А. Ю. Антропава, Н. С. Арлова, К. С. Барадзіна, Л. А. Блохіна, Ж. В. Бойка, А. В. Быстрова, Л. В. Бязрукава, В. М. Васіна, І. В. Вяршыніна, В. А. Ільясава, Н. І. Карасцелева, Б. В. Кваша, Г. М. Кулаева, З. М. Літвінава, Т. А. Прыстаўкіна, Р. А. Рагожнікава, А. І. Талакнеева, А. В. Харашэнкава,

[1] *Сластенин, В. А.* Введение в педагогическую аксиологию : учеб. пособие для студентов высш. пед. учеб. заведений / В. А. Сластенин, Г. И. Чижакова. – М. : Академия, 2003. – С. 100.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Т. А. Ханалыеў, Р. М. Хаяртдзінава, А. А. Шамігулава, А. М. Шорахава, А. В. Шчаглова і інш.

К а ш т о ў н а с н а я ў с т а н о ў к а – усведамленне асобай сваёй унутранай пазіцыі і наяўнасць гатоўнасці да дзейнасці ў адпаведнасці з пэўнымі каштоўнасцямі. Каштоўнасныя ўстаноўкі разглядаліся ў работах Л. В. Вядзернікавай, І. А. Канеевай, П. А. Куксы, А. І. Ярашэнкавай і інш.

К а ш т о ў н а с н а я а р ы е н т а ц ы я – сістэма ўстойлівых адносін асобы да навакольнай рэчаіснасці і самога сябе ў форме фіксаваных установак на тыя ці іншыя каштоўнасці матэрыяльнай або духоўнай культуры грамадства. Гэтым пытанням прысвечаны работы А. М. Аляксандравай, Г. А. Аргуновай, Л. І. Барбашовай, К. В. Баталінай-Корневай, Н. А. Благадаравай, У. І. Блінова, А. Г. Буянкінай, А. М. Бяловай, А. Б. Бяляевай, А. С. Ванінай, Т. В. Геваркян, Э. В. Зауторавай, Н. Ю. Зубенка, А. С. Кайчуевай, П. А. Кукса, К. Ю. Лаўрынца, Т. В. Міхайлавай, І. В. Ржэпянскай, А. Л. Рудневай, А. І. Сухавай, С. Г. Сцепанца, І. Л. Федаценкі, С. В. Ціханавай, А. В. Чыжыкавай, В. Б. Яршовай і інш.

К а ш т о ў н а с н ы я п а в о д з і н ы чалавека ўключаюць розныя акты функцыянавання арганізма, якія праходзяць у знешнім асяроддзі і могуць назірацца іншымі людзьмі. Афектыўныя, кагнітыўныя, рухальныя паводзіны ўключаюць пэўныя станы, рэакцыі, рухі, дзеянні, учынкі чалавека. Асаблівае значэнне маюць усвядомленыя, валявыя, эмацыянальна афарбаваныя паводзіны згодна з унутранымі рэгулятарамі (адносінамі, устаноўкамі, арыентацыямі), якія, акрамя біялагічнай, адлюстроўваюць сацыяльную прыроду чалавека. Каштоўнасныя паводзіны – мэтанакіраваныя дзеянні чалавека, унутранымі рэгулятарамі якіх з’яўляюцца каштоўнасная свядомасць, адносіны, устаноўкі, арыентацыі. Распрацоўкай праблем фарміравання каштоўнасных паводзін чалавека займаліся А. Я. Бачарава, В. М. Заматаева, Р. Р. Мусліваў, Ю. А. Хадарэўская, Э. І. Шарапава і інш.

На сённяшні дзень нам не вядомы работы беларускіх аўтараў, цалкам прысвечаныя праблеме фарміравання этнакультурных каштоўнасцей асобы. Аналіз работ некаторых сучасных расійскіх аўтараў (Н. М. Бадмахалгаевай, А. А. Гушчынай, У. М. Джашакуева, Д. К. Сурганавай), прысвечаных тэарэтычным і практычным праблемам фарміравання этнакультурных каштоўнасцей асобы, паказвае на недастатковую асэнсаванасць вучонымі дадзенага феномена, нават на адсутнасць тлумачэння

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэрміна ў некаторых работах, цалкам яму прысвечаных, на неразмежаванасць або падмену паняцця *этнакультурныя каштоўнасці* іншымі роднаснымі паняццямі, такімі як *этнічная ідэнтычнасць, менталітэт, этнічная культура*. Абазначаная сітуацыя ўскладняецца таксама недастатковым асэнсаваннем розніцы (агульнасці) такіх паняццяў, як *агульначалавечыя, нацыянальныя, этнічныя (этнакультурныя) каштоўнасці.*

Важным для нашай работы з'яўляецца паняцце *этнічная культура*, якое ўключае сукупнасць элементаў матэрыяльнай і духоўнай культуры этнасу. Гэтыя элементы культуры адначасова з'яўляюцца своеасаблівымі этнадыферэнцыруючымі сімваламі, адметнымі культурнымі рысамі, прыкметамі этнасу. У структуру этнакультурных каштоўнасцей можна ўключыць перш за ўсё тыя кампаненты, для якіх характэрны традыцыйнасць і ўстойлівасць: звычаі, абрады, народнае мастацтва, нормы паводзін і г. д. У сучасных умовах носьбітам этнічнай спецыфікі можа выступаць і прафесійная духоўная культура (у першую чаргу мастацкая), мова і гісторыя.

З улікам сказанага, мы разумеем паняцце *этнакультурныя каштоўнасці* з пазіцый педагагічнай навукі як сукупнасць асобасных якасцей, якія ўключаюць каштоўнасныя свядомасць, адносіны, устаноўкі, арыентацыі, паводзіны чалавека ў дачыненні да такіх асноўных складнікаў этнічнай культуры беларусаў, як нацыянальная мова, народнае і прафесійнае мастацтва, традыцыі, абрады, звычаі, нормы паводзін і гісторыя.

Такім чынам, на сённяшні дзень у педагагічнай навуцы існуюць некаторыя падыходы, звязаныя з разуменнем сутнасці, структуры і спецыфікі каштоўнасцей, а таксама феномена этнічнасці. Праблемы асэнсавання этнакультурных каштоўнасцей як педагагічнай з'явы застаюцца актуальнымі і патрабуюць далейшай навуковай распрацоўкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ